**2 верасня 2024 г. - 185 гадоў з дня нараджэння Івана (Іаана) Антонавіча Катовіча (1839-1911), вядомага праваслаўнага царкоўнага дзеяча, даследчыка гісторыі распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі, педагога, бібліяфіла, публіцыста, журналіста**



Іван (Іаан) Антонавіч Катовіч нарадзіўся 2 верасня 1839 года ў в. Чаравачыцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер в Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці). Паходзіў са старажытнага беларускага праваслаўнага святарскага роду. Старэйшы сын протаіерэя Антонія Ануфрыевіча Катовіча. Браты Івана – Фама, Мікалай, Міканор, Аляксей – таксама былі святарамі, сёстры – Марыя, Юстына, Алена – выйшлі замуж за асоб духоўнага звання.

Першапачатковую адукацыю Іван Катовіч атрымаў дома. Паступіў у Кобрынскае духоўнае вучылішча, якое было адным з трох навучальных устаноў такога роду ў Гродзенскай губерні. У вучылішчы рыхтавалі хлопчыкаў да паступлення ў духоўную семінарыю. Вучылішча складалася з трох аддзяленняў, курс навучання працягваўся тры гады, дзеці паступалі ва ўзросце ад 9 да 11 год.

Пасля заканчэння Кобрынскага духоўнага вучылішча ў 1855 годзе Іван Катовіч паступіў у Літоўскую духоўную семінарыю ў Вільні. Для гэтага яму давялося здаць шэсць экзаменаў: па геаграфіі, арыфметыцы, катэхізісе, рускай, лацінскай і грэчаскай мовах. Навучанне ў семінарыі было ўсебаковым, акрамя багаслоўскіх прадметаў вывучалася і шмат свецкіх.

У 1861 годзе Іаан Катовіч заняў пасаду настаўніка ў Кобрынскім духоўным вучылішчы, пачаў друкавацца ў газеце «Дух христианина», рэдактар якой А. Гумілеўскі настойліва рэкамендаваў яму для працягу адукацыі ехаць у Пецярбургскую духоўную акадэмію. Раней талент і розум І. Катовіча былі заўважаны мітрапалітам Іосіфам Сямашкам. 5 снежня 1863 года Іаана Катовіча без экзаменаў залічылі ў акадэмію.

З акадэміі ён вынес багаты запас ведаў, а галоўнае - маральны абавязак і гатоўнасць аддаваць усе свае сілы і

працу на карысць роднага краю. Настаўнікам Іаана Катовіча быў Міхаіл Восіпавіч Каяловіч - вядомы прадстаўнік беларускай гістарычнай думкі другой паловы XIX стагоддзя, публіцыст і грамадскі дзеяч, прафесар рускай грамадзянскай гісторыі Санкт-Пецярбургскай духоўнай акадэміі.

Скончыўшы акадэмію, у 1867 годзе І. А. Катовіч прыязджае ў Вільню, дзе на працягу года працуе ў Публічнай бібліятэцы, чакаючы адкрыцця штата ў найстаражытнейшым Віленскім саборы Раства Багародзіцы. 2 жніўня 1868 года мітрапаліт Іосіф прыняў прашэнне прызначыць І. А. Катовіча святаром у названы сабор. Святарскае пасвячэнне Іаана Катовіча 29 верасня 1868 года здзейсніў епіскап Брэсцкі Ігнацій Жалязоўскі. Апякун Віленскай навучальнай акругі 1 кастрычніка прызначыў І. А. Катовіча законавучыцелем рэальнай гімназіі (пазней — вучылішча). Такім чынам, І. А. Катовіч вярнуўся да педагагічнай дзейнасці і праявіў сябе таленавітым арганізатарам і кіраўніком навучальнага працэсу.

20 снежня 1869 года Св. Сінод зацвердзіў І. А. Катовіча на пасаду рэдактара «Литовских епархиальных ведомостей» (ЛЕВ). З таго часу паралельна з асноўнай працай найважнейшай часткай яго дзейнасці стала газета, рэдактарам якой Іван Антонавіч быў звыш 30 гадоў (1869-1903). Пад кіраўніцтвам І. А. Катовіча «ЛЕВ» атрымалі росквіт, а рэдакцыя згуртавала знакамітых дзеячаў свайго часу — І. С. Аксакава, А. В. Бялецкага, А. С. Будзіловіча, У. В. Качаноўскага, Ю. Ф. Крачкоўскага і многіх іншых. Іван Антонавічператварыў газету ў адно з лепшых перыядычных выданняў Расійскай імперыі, у якім з'яўляецца і мноства яго нарысаў, артыкулаў, у тым ліку «Историческая записка о литовской духовной семинарии» (1878 г.), «Высокопреосвященный Алексий, архиепископ Литовский и Виленский» (1890 г.), «Торжество 50-летия воссоединения униатов» (1889 г.), «Слово в день празднования 300-летнего юбилея со времени построения Свято-Духовым братством церкви Святого Духа в г. Вильне» (1897 г.). Пяру журналіста І. А. Катовіча належала вялікая колькасць артыкулаў пра гісторыю манастырэй і цэркваў краю, а таксама некралогаў. Супрацоўнічаў з часопісамі «Православное обозрение», «Виленский календарь» і інш.

У 1873 годзе І. А. Катовіч пад кіраўніцтвам прафесара М. В. Каяловіча паспяхова абараніў магістарскую дысертацыю «Первоначальная история христианства в нынешнем Северо-

Западном крае России до Великого князя Литовского Ягайлы» і па рашэнні рады Пецярбургскай духоўнай акадэміі, зацвярджэнні Св. Сінода яму была прысуджана вучоная ступень магістра багаслоўя. Маладому вучонаму ў гэты час было 34 гады.

У 1875 годзе быў узведзены ў сан протаіерэя і неўзабаве прызначаны настаяцелем сабornай царквы ў Вільні.

Рана выступіўшы на педагагічнай ніве ў розных навучальных установах (выкладаў у Кобрынскім і Віленскім духоўных вучылішчах, Віленскім рэальным вучылішчы), І. А. Катовіч выявіў сябе не толькі як арганізатар і кіраўнік навучальнага працэсу, але і як чалавек, неабыякавы да пытанняў пастаноўкі адукацыі ў краі. Пра гэта сведчыць шэраг яго артыкулаў па царкоўна-школьнай справе, народнай адукацыі, педагогіцы, а таксама тое, што ён быў нязменным старшынёй і кіраўніком епархіяльных з'ездаў. 11 гадоў з’яўляўся членам педагагічнага сходу кіравання Літоўскай духоўнай семінарыі.

Быў ініцыятарам і распрацоўшчыкам метадычных матэрыялаў у дапамогу духавенству для напісання царкоўна-прыходскіх летапісаў, якія і ў цяперашні час не страцілі значэння для развіцця царкоўнага краязнаўства. Захаваўся цэлы шэраг рукапісных зборнікаў, якія протаіерэй вывучаў як узоры народнай літаратуры. Частку з іх ён падараваў у 1860-я гады публічнай бібліятэцы Вільні (цяпер яны захоўваюцца ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Літоўскай акадэміі навук).

Рэлігійную, навуковую і педагагічную дзейнасць І. А. Катовіч сумяшчаў з грамадскай. Ён уваходзіў у Віленскую гарадскую думу, у шэраг навуковых таварыстваў і камітэтаў, з'яўляўся членам Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства, прымаў актыўны ўдзел у «Трудах» Віленскага аддзялення IX археалагічнага з'езда.

Аўтар шматлікіх даследчых прац, артыкулаў. Ужо ў перыяд настаўніцтва ў яго выяўляюцца схільнасці да даследчай працы па вывучэнні свайго краю. Вучні і паплечнікі айца Іаана часта ўспаміналі пра яго асаблівую ўвагу да народнай культуры, традыцыйнага сялянскага побыту, народнага духоўнага свету, які ён вывучаў і заклікаў іх у гэтым рушыць услед за ім.

Родам з Кобрыншчыны, Іаан Катовіч памятаў свае карані, падтрымліваў цесныя сувязі са сваёй сям'ёй і ўвесь час цікавіўся падзеямі гісторыі і сучаснасці малой радзімы.

Даследаваў гісторыю праваслаўных храмаў Кобрыншчыны. Падчас працы ў Кобрынскім духоўным вучылішчы збіраў палескі фальклор для выдання Пятра Гільтэнбранда «Сборник памятников народного творчества в Северо-Западном крае». Удзельнічаў у падрыхтоўцы да друку матэрыялаў для кнігі «Дакументы, якія тлумачаць гісторыю Заходнярускага краю і яго адносіны да Расіі і Польшчы» (1865).

На старонках газеты «ЛЕВ» друкуе артыкулы: гістарычны нарыс «О православных церквях в г. Кобрине», «Об обычаях ставить кресты на открытых местах северо-западного края России», «Из Кобринского уезда», «Завещание помещицы Верещаковой» (аб гісторыі Буховіцкай царквы), «О событиях 8 сентября в с. Берёза», «Освящение каменной Соборной церкви в городе Кобрине», «Протоирей Антоний Котович», «О построении и освещении церквей» (з гісторыі Буховіцкай царквы) Актыўнымі карэспандэнтамі «ЛЕВ» былі браты Міканор Катовіч, Васілій Катовіч і Фама Катовіч: друкавалі свае артыкулы, павучанні, водгукі наконт юбілеяў, прамовы над труной памерлых мясцовых святароў.

Заслугі айца Іаана на пастырскай і грамадскай ніве высока ацэньваліся. Сярод найвышэйшых узнагарод — ордэн Святой Ганны І ступені.

Памёр выдатны пастыр, народжаны кобрынскай зямлёй, 18 снежня 1911 года пасля працяглай і цяжкай хваробы. Пахаванне адбылося 21 снежня 1911 года на віленскіх праваслаўных Ефрасіннеўскіх могілках. Некралог быў змешчаны ў «ЛЕВ» на другой старонцы № 1 за 1912 год. Многія члены роду Катовічаў пахаваны ў Чаравачыцах Кобрынскага раёна. Чаравачыцкая царква карысталася працэнтамі са 150 рублёў, завешчаных ёй маскоўскім святаром Іаанам Зернавым і ўдавой І. Катовіча на яго вечнае памінанне.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2019 г., дапоўнены ў 2024 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф*
*аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

***Працы І. А. Катовіча***

**Котович, И. А.** Высокопреосвященнейший Алексий, архиепископ Литовский и Виленский : Его кончина и погребение 10-13 ноября 1890 г. / И. А. Котович. - Вильна, 1890. – 40 с.

**Котович, И. А.** Историческая записка о Литовской духовной семинарии / И. А. Котович. - Вильна, 1878. - С. 99-100.

**Котович, И. А.** Как смотреть на обычай ставить кресты при дорогах, площадях, полях и других открытых местах Северозападного края России? / Иоанн Котович. – Вильна, 1868.

**Котович, И. А.** Первоначальная история христианства в нынешнем Северо-Западном крае России до великого литовского князя Ягайлы / И. А. Котович.- СПб., 1873.

**Котович, И. А.** Слово в день празднования 300-летнего юбилея со времени построения Свято-Духовским братством церкви Св. Духа в г. Вильне / И. А. Котович. - Вильна, 1897.

**Котович, И. А. Слово** в день 500-летия со дня кончины прп. и богоносного отца нашего Сергия, Радонежского чудотворца, 25 сентября 1892 г. сказанное в виленском Николаевском соборе / Иоанн Котович. – Вильна, 1892.

**Котович, Иван Антонович**. Слово 7-го ноября 1898 года на заупокойной литургии, накануне освящения и открытия памятника графу М. Н. Муравьеву / Иоанн Котовича. - Вильна, 1898. - 10 с.

**Котович, И. А.** О православных церквях в г. Кобрине / И. А. Котович // Виленский вестник. - 1869.

**Котович, И. А.** Богогласник, его значение и употребление в народе / И. А. Котович // Виленский вестник. - 1866. - № 127.

### *Аб жыцці і дзейнасці І. А. Катовіча*

**Котович Иван (Иоанн) Антонович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 505-506.

**Чарапіца, В.** Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 149.

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 223.

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Рэлігія і царква на Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 154.

**Ильин, А.** Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине / А. Ильин. - Гродно, 2005. - Ч. 2.

**Мароз, В. В.** Драўляныя сакральныя помнікі Берасцейшчыны : нарысы гісторыі, археалогіі і культуры / В. В. Мароз. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2018. – 512 с.

Гл. на с. 49, 50 – І. А. Катовіч.

**Симонова, И. Э**. Возвышенное и земное в роду Котовичей / Ирина Симонова // Карані і кроны : гісторыя Кобрыншчыны: першая палова ХХ стагоддзя / [укладальнікі: Ю. А. Барысюк, А. А. Мезенцэва]. - Брэст, 2017. - С. 36-43.

**Черепица, В. Н.** М. О. Коялович : история жизни и творчества / В. Н. Черепица. - Гродно, 1998.

**Щавинская, Л. Л.** Народная православная книжность в собрании и исследованиях Иоанна Котовича : материалы к спецкурсу «Белорусская народная рукописная книжность ХХ-ХХI вв.» / Л. Л. Щавинская. - Москва-Минск, 2010. – 28 с. : ил.

**Шимолин, В. И.** У истоков белорусской печати : епархиальные ведомости второй половины XIX – начала ХХ в. / В. И. Шимолин. – Минск : БГУ, 2010. – 199 с.

**Шимолин, В. И.** Епархиальные периодические издания в развитии духовной культуры белорусов (вторая половина XIX – начало XX вв.) : автореферат диссертации ... кандидата филологических наук / В. И. Шимолин ; БГУ. – Минск, 2010. – 21 с.

**Чистяков, П.** Церковно-краеведческая проблематика епархиальных ведомостей, издававшихся в Беларуси во второй половине XIX, начале XX ст. : кандидатская диссертация / П. Чистяков. Жировичи, 2004.

**Нецветаев, А.** Литовские епархиальные ведомости как источник по истории Православной Церкви Белоруссии : кандидатская диссертация / А. Нецветаев. Жировичи, 2003.

**Иоанн Антонович Котович** (1839–1911 годы) / работа подготовлена членами организации «Золотой возраст», И. Э. Симонова. – Кобрин, 2011. – 21 с.

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук. – Кобрын, 2020. – С. 65-67 : фат.

**185 гадоў з дня нараджэння І. А. Катовіча (1839)** // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-

бібліяграфічны каляндар на 2016–2020 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 123-124.

**Васюк, Н.** Батюшка от Бреста до Пинска / Наталья Васюк // Вечерний Брест. - 2014.— 18 апреля.— С. 8.

О роде Котовичей – священников, рожденных на Кобринщине.

**Ильин, А.** Черевачицкие Котовичи – священники, деятели культуры и просто люди / Александр Ильин // «Гістарычная Брама». - 2016. — № 1 (26), № 2.

**Иоанн Антонович Котович** // Кобрин-информ. – 2011. – 21 июля. – С. 28-29 ; 28 июля. - С. 28–29.

**Ильин, А.** Библиограф Алексей Родосский об Иоанне Котовиче / А. Ильин // Гістарычная брама. – 2004. - № 1. – С. 46-47.

**Ильин, А.** Волчинское ответвление рода Котовичей / А. Ильин // Гістарычная брама. - 2004. - № 1. - С. 47-48.

**Ильин, А.** Полесские священники Котовичи / А. Ильин // Гістарычная брама. - 2004. - № 1. - С. 29-40.

**Черепица, В.** Два юбилея в жизни протоиерея Иоанна Котовича / В. Черепица // Гістарычная брама. - 2004. - № 1. - С. 42-46.

**Иоанн Антонович Котович** (1839-1911 годы) / работа подготовлена членами организации «Золотой возраст», И. Э. Симонова. – Кобрин, 2011. – 21 с.

Кобрынскі раён
Чаравачыцы
Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч
Царкоўныя дзеячы
Гісторыкі
Педагогі
Журналісты